Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!
Камуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

ОРГАН ЦК КП(б) БЕЛАРУСІ, СОЎНАРКОМА
І ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

64 (7390)
НЯДЗЕЛЯ
8
красавіка 1945 г.

Цана 20 кап.

Нястомна клапаціцца пра добрабыт нашых гарадоў

Немецка-фашысцкія захопнікі ў сваёй
ненавісці да ўсяго совецкага,
ўсяго таго, што было створана рукамі
правітых совецкіх людзей, разбуралі
і гарады, ператваралі іх у пустыню.
Беларусі не асталося ніводнага горада,
не папярэў-бы ад нямецкіх факель-
каў і разбуральнікаў.

Найшоўшыя месяцы з дня вызвалення
Беларусі ад нямецкіх захопнікаў далі
свае плады; на нашых гарадах ві-
адбітак той натхнёнай адноўленчай
ы, якой жывуць прапоўныя
ублікі, якой поўны прапоўныя будні
вускага народа. З наступленнем вясны
адноўленчыя работы ў гарадах павінны
арнуцца з новай сілай; узначальвае-
партыйнымі і совецкімі арганізацыя-
енародны рух па ўдзелу ў адноўлен-
работах павінен шырыцца з дня на
ень.

Колькія яшчэ сляды разбурэння ў на-
гарадах, многа чаго ў іх нехапае.
задача заключаецца ў тым, каб і
пяперашніх умовах арганізаваць
ную і шырокую барацьбу за добра-
гарадоў і гарадскога насельніцтва,
тварэнне ў гарадах умоў нармальнага
ня. Спасыланні на ваенны час, на
асці не могуць быць прыняты пад
у.

Яма патрэбы даводзіць, што і пры
рашніх умовах добрабыт нашых гара-
мог-бы быць куды больш упарадкава-
чым ён ёсць на самой справе.
ось факты.

З гэтага часу ў нас надзвычай зрэд-
трапуюць гарадскія лазні. Тым больш
пушчальна гэта для Мінска, дзе лаз-
трапуюць з вялікімі перабоямі, а часа-
усім бяздзейнічаюць. Амаль усю зіму
трапавала гарадская лазня ў Мазыры,
ледзячы на тое, што ўмовы для яе
ты былі ў наяўнасці. Гэты абураючы
аднак ніколькі не хваляваў старшыню
анкома Мазырскага горсовета тав.
льчука. Дрэнна абстаіць у нас справа
грамадскімі пральнямі. Гарадской
ні да гэтага часу не мае яшчэ нават
к.

Темпы з асаблівым шаленствам знішчы-
ў гарадах сады, паркі і скверы, вы-
сякалі зялёныя насаджэнні. Сады і паркі
забруджаны. Аднак, не гледзячы на гэта,
гарадскія комунальныя адзелы не прымаюць адпаведных захадаў для таго, каб упарадкаваць сады, паркі і скверы. Мінчане ганарыліся сваім садам імені Горкага. Без асаблівых затрат яго можна было-б упарадкаваць і пяпер, аднак горкомгас і Трэст зялёнага будаўніцтва на сутнасці справы яшчэ нават не пачалі адноўленчых работ у парку. Тое-ж самае можна сказаць пра гарадскі гомельскі парк, які быў красой не толькі аднаго Гомеля, але і ўсёй нашай рэспублікі. Дарэчы сказаць, Трэст зялёнага будаўніцтва працуе наогул нездавальняюча і не выконвае ім-жа самім прынятых планаў па дрэванасаджэннях, па арганізацыі аранжарэй, кветнікаў, газонаў і г. д.

Час ужо, каб у нашых гарадах паявіліся «амерыканкі» па рамонту абутку, адзення, па ўпюжны і іншыя. На вялікі жаль, такіх «амерыканак» не мае нават Мінск, і пакуль што не відаць, каб Белкаапромсовет і арцелі, па ўласнай ініцыятыве, прыступалі-б да стварэння такіх вельмі важных адзінак бытавога абслугоўвання.

Надышла вясна. Надзвычай важна, каб у гарадах паявіліся ларкі з прахладжальнай вадой, квасам і півам, кветкавыя кіоскі. Іх-жа пакуль што зусім няма.

З усёй сур'ёзнасцю трэба гаварыць пра санітарную запушчанасць некаторых нашых гарадоў. Як паведамляюць нам з Магілева, многія вуліцы і двары тут надзвычай захламлены. У многіх дварах няма смеццевых ям, смецце і адкіды звальваюцца на адкрытых месцах, становячыся рассадзнікамі антысанітарыі. У горадзе зусім мала грамадскіх прыбіральняў. Дзіўна тое, што такое становішча ніколькі не хвалюе работнікаў горкомгаса і яго загадчыка тав. Мяцеліну. Гарадскі комунальны аддзел не прымае дзейсных мер для прывядзення горада ў ахайны і ўзорны ў санітарных адносінах выгляд.

Не лепш абстаіць справа з санітарным утрыманнем і горада Мінска. На апошняй сесіі мінскага гарадскога совета было прынята рашэнне аб правядзенні месячніка па навядзенню чыстаты. Гэты месячнік пачаўся 25 сакавіка. Аднак трэба сказаць, што прайшоўшыя два тыдні не прынеслі жаданых вынікаў, таму што горсовет недастаткова мабілізаваў грамадскасць для ўдзелу ў гэтым месячніку, а выканкомы райсоветаў дэпутатаў працоўных, у сваю чаргу, не надалі гэтаму мерапрыемству прынцыповага значэння. У многіх месцах горада па-ранейшаму пануе антысанітарыя: двары, як правіла, захламлены, няма смеццевых ям і г. д. Санітарны трэст, для якога правядзенне месячніка павінна было стаць кроўнай справай, працуе непапушчальна дрэнна. Дарэчы час ужо выканкомам гарадскіх советаў выдаць абавязковыя правілы ўтрымання гарадоў, вуліц і дамоў у чыстаце і ўскласці адпаведную адказнасць за ўсё гэта на ўстановы, дамаўпраўленні і саміх жыхароў.

Мы закранулі тут толькі некаторыя пытанні арганізацыі гарадскога добрабыту. Вядомая рэч, што імі не вычэрпваецца ўвесь комплекс работ, якія прадстаіць настойліва і сістэматычна ажыццяўляць у імя палепшання ўмоў жыцця гарадскога насельніцтва.

Пытанні добрабыту горада — вельмі важныя. Іх трэба вырашаць сістэматычна і настойліва, памятаючы, што яны — адна з баявых задач партыйных, совецкіх і гаспадарчых арганізацый у справе аднаўлення разбуранай ворагам народнай гаспадаркі, у справе ліквідацыі вынікаў нямецкай акупацыі. Да пытанняў добрабыту гарадоў павінна быць прыкавана ўвага ўсіх нашых арганізацый і асабліва органаў комунальнай гаспадаркі, арганізацый гандлюючых і прамысловых. Асабліва вялікую ролю ў пытаннях арганізацыі добрабыту горада павінны адыграць наркаматы комунальнай гаспадаркі і гандлю, Белкаапромсовет, ад якіх у гэтым сэнсе залежыць многае.

Важна таксама, каб на рашэнне задач, звязаных з арганізацыяй гарадскога добрабыту, была мабілізавана ўся наша грамадскасць, усё насельніцтва гарадоў.

Зробім-жа ўсё для таго, каб хутчэй аднавіць разбураныя ворагам беларускія гарады, каб хутчэй і лепш арганізаваць іх добрабыт, каб хутчэй закрасавалі яны на радасць нашага народа!

ПРЫЁМ І. В. СТАЛІНЫМ ПАНІ К. ЧЭРЧЫЛЬ

4 красавіка Старшыня Совета Народ-
ных Камісараў СССР І. В. Сталін пры-
няў Старшыню Брытанскага Камітэта
«Фонда Дапамогі Расіі» пані Клементыну
Чэрчыль.

На прыёме прысутнічалі Народны Ка-
місар Замежных Спраў СССР В. М. Молатаў і Сакратар Камітэта «Фонда Дапамогі Расіі» пані М. Джонсон.

Сведанне ў Народнага Камісара Замежных Спраў В. М. Молатава ў чэсць Старшыні Совета Міністраў Югаславіі Маршала І. Броз-Тіто і Міністра Замежных Спраў пана І. Шубашыча

4 красавіка Народны Камісар Замеж-
ных Спраў В. М. Молатаў даў сведанне ў
чэсць Старшыні Совета Міністраў Югаславіі
Маршала І. Броз-Тіто і Міністра Замежных Спраў І. Шубашыча.

На сведанні прысутнічалі Маршал
Броз-Тіто, Міністр Замежных Спраў Югаславіі пан І. Шубашыч, Міністр па справах Чорнагорыі генерал-лейтэнант М. Джылас, Міністр Гандлю і Снабжэння Н. Петровіч, Міністр Горнай Прамысловасці пан Б. Андрэеў, Пасол Югаславіі ў СССР пан С. Сіміч, Начальнік Югаславскай Ваеннай Місіі ў СССР генерал-лейтэнант Р. Прыморац, другія суправаджаючыя Маршала Тіто асобы і адказныя супрацоўнікі Пасольства Югаславіі ў Маскве.

З совецкага боку прысутнічалі А. І. Мікаян, адмірал флота Н. Г. Кузнецоў, А. Я. Вышынскі, В. Г. Дзеканозаў, Галоўны Маршал артылерыі Н. Н. Воранаў, Начальнік Генеральнага Штаба Чырвонай Армії генерал арміі А. І. Антонаў, Пасол СССР у Югаславіі І. В. Садчыкаў, Маршал авіяцыі Ф. Я. Фалалееў, А. Д. Крупікаў, Г. М. Папоў, генерал-палкоўнік Ф. І. Голікаў, загадчык 4-га Еўрапейскага Аддзела НКЗС СССР А. А. Лаўрышчэў, Загадчык Пратакольнага Аддзела НКЗС СССР Ф. Ф. Малачкоў, генерал-лейтэнант А. С. Гундораў, Начальнік Совецкай Ваеннай Місіі ў Югаславіі генерал-маёр А. Ф. Кіселёў, генерал-маёр М. П. Кутузаў, адказныя супрацоўнікі НКЗС СССР.

Сведанне прайшло ў дружаственнай атмасферы.

Ад Совецкага Інформбюро

АПЕРАТЫЎНАЯ ЗВОДКА ЗА 7 КРАСАВІКА

На працягу 7 красавіка ў палосе КАРПАТ, на паўночным захадзе ад горада КАМБЕРОК, войскі 4-га УКРАІНСКАГА фронта з баямі заняялі больш 30 населеных пунктаў і сярод іх БРЭНІКА, МАЛІНКА, КАМЕШНІЦА, УЙСОЛЫ, РОЗТОКІ, СТАНКОВАНІ, ГОМБАШ.

На паўночным усходзе і поўначы ад БРАЦІСЛАВЫ войскі 2-га УКРАІНСКАГА фронта, прадаўжаючы наступленне, заняялі горад НОВЕ МЕСТО і больш 50 другіх населеных пунктаў, у тым ліку буйныя населеныя пункты КШЫНА, УГРОВЕЦ, ЧНЫЦА, ЧАХЦІЦЭ, КАСТОЛНЕ, БРЭЗОВА, ГЛБОКЕ, СЕНІЦА, ЧАЧОЎ, ШТЭПАНОЎ, СОЛІНСКЕ. У гэтым раёне на наш бок перайшлі з поўным узбраеннем рэшткі 24 венгерскай пяхотнай дывізіі на чале з камандзірам дывізіі палкоўнікам Мужон і іншымі штабам.

У раёне ВЕНЫ войскі 3-га УКРАІНСКАГА фронта, прадаўжаючы наступленне, заняялі гарады МЕДЛІНГ, ПРЭСБАУМ, КЛОСТЭРНАЙБУРГ, выйшлі да ДУНАЯ на паўднёвым захадзе ад ВЕНЫ і завязалі вулічныя баі ў паўднёвай частцы горада ВЕНЫ. Начасова на паўднёвым захадзе ад возера БАЛАТОН войскі фронта, наступаючы разам з войскамі балгарскай арміі, заняялі горад і чыгуначны вузел ЧАКОВЕЦ, горад і чыгуначную станцыю МУРСКА-СРЭДЗІШТЭ. У баях за 6 красавіка войскі фронта знішчылі ў палон больш 3.600 салдат і афіцэраў праціўніка і захапілі наступныя трафеі: самалётаў—11, танкаў—22, палявых гармат—78, кулямётаў—127.

На другіх участках фронта — пошукі разведчыкаў і ў радзе пунктаў баі мясцовага значэння.

За 6 красавіка на ўсіх франтах падбіта і знішчана 28 нямецкіх танкаў і самаходных гармат. У паветраных баях і агнём зенітнай артылерыі збіта 14 самалётаў праціўніка.

* * *

У палосе Карпат войскі 4-га Украінскага фронта з баямі прасоўваліся ўперад. На пяхота пераадолела горны хрыбет Жывецкі і атакавала немцаў, якія акопаваліся ў вузкай горнай даліне. Выніку імклівага ўдару варожыя падзяленні былі разгромлены. На полі бою асталося многа трупаў салдат і афіцэраў праціўніка. Захоплена 5 гармат, 60 аўтамашын і ўзята ў палон больш 100 немцаў. На другім участку праціўнік умацаваўся на схілах гор і моцным агнём перашкаджаў шлях нашым войскам. Совецкія часці зрабілі абходны манеўр і з фланга атакавалі немцаў. Гітлераўцы не вытрымалі ўдару і пачалі паспешна адступаць. Развіваючы поспех, нашы войскі авалодалі чыгуначнай станцыяй Станкавані і захапілі тры паравозы і 126 вагонаў з грузамі.

* * *

На паўночным усходзе ад Брацісавы нашы войскі прадаўжалі весці наступальныя баі. Праціўнік, апіраючыся на загадзя падрыхтаваныя абаронныя рубяжы, аказвае ўпорнае супраціўленне і часта пераходзіць у контратакі. Совецкія часці, прасоўваючыся на поўнач, уздоўж ракі Ваг, выйшлі на подступы да вельмі ўмацаванага пункта абароны немцаў — горада Нове Место. Гітлераўцы прабавалі любой цаной утрымаць гэты горад у сваіх руках. Яны спешна падцягнулі рэзервы і кінулі іх у бой. Нашы войскі выбілі ворага з пануючых над мясцовасцю вышынь, а затым у выніку бою, авалодалі горадам Нове Место—важным вузлом шляхоў зносін.

На поўначы ад Брацісавы совецкія пехацінцы з баямі прасоўваліся ўперад у цяжкіх умовах горна-лясістай мясцовасці. Шырока прымяняючы абходныя манеўры, нашы падраздзяленні акружаюць варожыя апорныя пункты і ліквідуюць іх гарнізоны. Совецкія часці пераправіліся праз раку Міява і занялі населены пункт Сеніца, які знаходзіцца ў 25 кілометрах ад чэхаславацкага горада Гадонін. Нанесены цяжкія страты нямецкай пяхотнай дывізіі, якая ўсяго толькі некалькі дзён таму назад уведзена ў бой на гэтым участку фронта.

* * *

У раёне Вены войскі 3-га Украінскага фронта прадаўжалі наступленне. Нашы

(Працяг на 2-й стар.).

Уключаемся ва ўсесаюзнае і ўсебеларускае соцыялістычнае спаборніцтва за высокі ўраджай 1945 года

Узорна правядзем веснавую сяўбу!

Зварот

калгаснікаў і калгасніц сельгасарцелі імені Варашылава, Церахоўскага раёна, Гомельскай абласці, да ўсіх калгаснікаў, калгасніц, трактарыстаў, трактарыстак, аграномаў, механікаў і інжынераў, да ўсіх работнікаў сельскай гаспадаркі Беларускай ССР

Дарагія таварышы!

Мы, калгаснікі і калгасніцы сельгасарцелі імені Варашылава, Церахоўскага раёна, Гомельскай абласці, абмеркаваўшы зварот калгаснікаў і калгасніц сельгасарцелі імені Чырвоных партызан, Брухавецкага раёна. Краснадарскага края, уключаемся ва ўсесаюзнае соцыялістычнае спаборніцтва за высокі ўраджай 1945 года.

У дні, калі па ўсёй совецкай зямлі пабедныя залпамі маскоўскіх салютаў грымяць слава вялікай Чырвонай Арміі-вызваліцельніцы, мы, калгаснікі і калгасніцы сельгасарцелі імені Варашылава, Церахоўскага раёна, стараемся ўсімі сіламі дапамагаць Чырвонай Арміі ў яе барацьбе за свабоду, незалежнасць і чэсць нашай любімай маці-Радзімы.

Наступае гарачая пасеўная пара. Выйдзем мы на палі, выйдзем стары і малады на нашу родную зямлю і прымемся за працу нястомную. І закіпіць на родных прасторах ад зары да зары работа спорная, работа дружная.

1944 год для нашай сельгасарцелі быў першым годам работы пасля вызвалення ад нямецкіх акупантаў. Гэта быў пяжкі для нас год. Пракляты вораг хацеў навек украсці наша шчасце і два доўгія годы акупацыі катаваў нас, піў нашу кроў.

Пры ім, пры немцу, нас не грэла сонца, мы не бачылі сініх нябёс, вуліцы нашы не чулі дзявочых песень, а твары не ведалі ўсмешак.

Да вайны вялізныя статкі пасвіліся па калгасных лугах. Было тады ў нас у арцелі 275 коней, 280 кароў, 265 свіней, 60 авечак, 350 пчаліных вулляў, 300 курэй і многа іншага дабра. Куды ўсё гэта падзелася? Пакраў і сажраў пражорлівы немец.

Пасля вызвалення роднай Беларусі ад нямецкіх разбойнікаў мы стварылі калгасную ферму буйнай рагатай жывёлы, аўпаферму, свінаферму, птушкаводчую ферму, на якіх ужо цяпер налічваецца 129 галоў буйнай рагатай жывёлы, 22 авечкі, свіна-матка і 8 падсвінкаў, 138 курэй і 38 гусей. Да канца гэтага года мы падвоім пагалоўе жывёлы і птушкі на нашых фермах.

У мінулым годзе, не гледзячы на выключныя пяжкасці, мы паспяхова правялі веснавую сяўбу. Працавалі, не ведаючы стомы. Нехапала цягла—капалі зямлю рыдлёўкамі, прывучылі да работы сваіх кароў і пасеялі ў час збожжавыя культуры, бульбу.

Клапатлівым доглядам пасеваў, добрай і своечасовай уборкай мы выраслілі і сабралі ніадрэнны ўраджай: па 60 пудоў жыта з гектара, па 54 пуды аўса, па 50 пудоў ячменю, па 72 пуды лубіну, па 450 пудоў бульбы. Восенню пасеялі 342 гектары азімага збожжа, столькі-ж, колькі сеялі да вайны.

Мы не толькі датэрмінова выканалі свае абавязацельствы перад дзяржавай, але яшчэ і звыш плана здалі ў фонд Чырвонай Арміі 1.600 пудоў збожжа і 3.500 пудоў бульбы. Мы поўнасцю забяспечылі сябе лепшым насеннем для правядзення веснавой сяўбы ў гэтым годзе. Стварылі фонд дапамогі інвалідам Айчыннай вайны, сіратам і старым, і ўжо выдалі з гэтага фонда 780 пудоў хлеба сем'ям, якія найбольш панярпелі ад немцаў. Пакінулі 1.200 пудоў збожжа для набыцця жывёлы.

Не імкнуліся мы да таго, каб пабольш выдаць на працадні, а перш за ўсё клапаціліся аб умацаванні арцельнай гаспадаркі, аб аказанні найбольшай дапамогі Чырвонай Арміі - вызваліцельніцы. На кожны працадзень у нас прышлося па паўтара кілограма збожжа і па два кілограмы бульбы. Гэтага зусім дастаткова для таго, каб жыць бязбедна.

У мінулым годзе ў соцыялістычным спаборніцтве калгасаў рэспублікі за высокі ўраджай і развіццё грамадскай жывёлагадоўлі мы заваявалі першае месца, за што атрымалі пераходны Чырвоны Спяг Соўнаркома Беларускай ССР і грашовую прэмію ў суме 30 тысяч рублёў.

Усё, што мы паспелі зрабіць,—толькі пачатак вялікай адноўленчай работы. Галоўныя нашы клопаты цяпер—пасеяць вясной правов збожжа на плошчы, роўнай даваеннай, і вырасціць высокі ўраджай. Гэта—наш першы абавязак перад Чырвонай Арміяй. Гэта—важнейшая ўмова далейшага развіцця ўперад па шляху адраджэння арцельнага жыцця, без чаго мы не ўяўляем сабе і стварэнне асабістага добрабыту.

Сабраўшыся напярэдадні вясновай сяўбы, мы абмеркавалі пастанову Соўнаркома СССР і ЦК ВКП(б) «Аб плане развіцця сельскай гаспадаркі на 1945 год». Яна ўказвае нам шлях барацьбы за далейшы рост і ўмацаванне калгаснай гаспадаркі. «Усямернае павышэнне ўраджайнасці і павелічэнне валавых збораў збожжа і іншых сельскагаспадарчых прадуктаў»—вось галоўная задача, пастаўленая перад намі партыяй і ўрадам.

Уступаючы ў соцыялістычнае спаборніцтва за высокі ўраджай 1945 года, мы абавязваемся:

Поўнасцю аднавіць пасеўную плошчу калгаса, расшырыць пасеў супроць 1944 года на 118 гектараў.

Атрымаць у 1945 годзе з кожнага гектара азімага жыта па 90 пудоў, ячменю па 90 пудоў, аўса па 80 пудоў, яравой пшаніцы па 60 пудоў, проса па 90 пудоў, грэчкі па 60 пудоў, ільносяма па 30 пудоў, ільновалакна па 20 пудоў і бульбы па 900 пудоў з кожнага гектара.

Для выканання гэтай задачы мы рашылі:

1. Правесці сяўбу толькі добротным насеннем. Калгас насеннем забяспечан поўнасцю, усё яно праверана і прызнана добраякасным.

2. Усе веснавыя работы правесці так, як гэтага патрабуе перадавая агратэхніка: пасеяць кожную культуру па лепшых папярэдніках, зберагчы вільгань на палях. Адразу, як толькі на глебе падсохнуць грэбні, забаранаваць усё зяблева і пры сяўбе пракультывіраваць, веснавое ворыва закончыць у самыя раннія тэрміны.

Сяўбу каласавых збожжавых культур правесці за 7 рабочых дзён, ільну—за 2 дні, пасадку бульбы—за 10 дзён і сяўбу позніх культур—за 4 дні.

Засеяць насенныя ўчасткі адборным гатункovым насеннем на лепшых глебах і ў спіслыя тэрміны (3 дні). Гэтыя ўчасткі мы ўжо выдзелілі і замацавалі за звенямі.

Аднавіць у гэтым годзе правільны васьмімпольны севазварот. Па плану веснавой сяўбы мы размяшчаем усе культуры ў палях севазвароту, а з выхадам у поле адновім граніцы палёў, паставім слупкі, правядзем межы.

3. Добра абслужыць трактарную брыгаду, каб машыны не прастойвалі. Для гэтага ў нас вылучаны сталыя прычэпшчыкі, возчыкі гаручага, падрыхтавана харчаванне для трактарыстаў, зроблен падвал для хавання гаручага і завезена гаручае ў брыгаду.

4. Каб скарыстаць жывое цягло з поўнай нагрузкай, усе коні замацаваны за аратымі, конюхі не дасыпаюць начэй, стараючыся найлепш накарміць коней, у час напаіць іх. У нас няма коней ніжэйсярэдняй укормленасці. Мы забраніраваді для рабочай жывёлы на веснавую сяўбу дастатковую колькасць лепшага сена і канцэнтратаў. Для догляду коней вылучаны вопытныя калгаснікі, на кожнага каня падрыхтавана збруя. У нас мала коней, але для паспяховага выканання плана пасеўных работ мы запражэм 60 сваіх кароў, якія стануць барапаваць, падвозіць насенне, валу, развозіць па полі гной.

5. Клопаты аб павышэнні плодароддзя глебы—адна з нашых галоўных задач. Вясной гэтага года мы пасеем 30 гектараў лубіну на насенне з тым, каб у далейшым мець зялёнае ўгнаенне, і зробім падсеў канюшыны на 70 гектарах. Праз год мы будзем мець сваё насенне канюшыны на цэлыя палі севазвароту і насенне лубіну для вырашчвання зялёнага ўгнаення.

Аднак важнейшай крыніцай павышэння плодароддзя зямлі з'яўляюцца мясцовыя ўгнаенні—торф і гной у першую чаргу. Мы ўнясем у гэтым годзе ў глебу 2 тысячы тон торфу і 10.800 вазоў гною. Цяпер мы заканчваем вывазку гною ў поле.

Апрача таго, мы будзем рабіць падкормку азімага жыта і ільну попелам, курыным памётам, гноевай жыжай і фекаліем. Уносячы такую колькасць угнаенняў у глебу, мы можам дверда разлічваць на добры ўраджай.

6. Правільна арганізаваць працу на вясенне-палявых работах. Умацаваць саставы брыгад і звенняў, не дапускаць абязлічкі ў скарыстанні зямель, рабочай жывёлы, інвентару. Моцнай прапоўнай дысцыплінай, укараненнем індывідуальнай і групавой адзельшчыны, разгортваннем соцыялістычнага спаборніцтва паміж брыгадамі і звеннямі і асобнымі калгаснікамі дабіцца высокай прадукцыйнасці працы, выканання і перавыканання норм выпрацоўкі.

Цяпер у нас створана 6 сталых палявodчых брыгад. За імі замацавана зямля ў палях севазвароту, замацаваны цягло, інвентар. Выходзячы са сваёй практыкі работы, стварылі на ўвесь сельскагаспадарчы сезон 11 сталых звенняў у саставе палявodчых брыгад для догляду бульбы, насенных участкаў і тэхнічных культур. Перагледжаны і зацверджаны агульным сходам нормы выпрацоўкі і аплаты працы.

Наш калгас у поўнай гатоўнасці сустракае веснавую сяўбу. Дзяржаўная камісія ад раёна правяла ў нашым калгасе дэтальную гаспадарчую праверку гатоўнасці да выхаду ў поле. Калгас імені Варашылава вытрымаў гэтую праверку—падрыхтаваўся да сяўбы выдатна.

Таварышы калгаснікі і калгасніцы! Уключайцеся ў соцыялістычнае спаборніцтва за выдатнае правядзенне сяўбы ў спіслыя тэрміны, за высокі ўраджай 1945 года.

Таварышы трактарысты, механікі і інжынеры МТС! Па прыкладу трактарыстаў, камбайнераў, аграномаў і механікаў Лохвіцкай МТС, Палтаўскай абласці, і Прапойскай МТС, Магілеўскай абласці, уключайцеся ў соцыялістычнае спаборніцтва і з першых дзён вясны дайце поўную нагрузку трактарам, дабівайцеся лепшага скарыстання трактарнага парка, павышайце якасць трактарных работ, выканайце ў лепшыя агратэхнічныя тэрміны свае вытворчыя абавязацельствы перад калгасамі, правядзіце сяўбу так, каб калгаснікі маглі ад душы сказаць вам—дзякуй!

Калгаснікі і калгасніцы, рабочыя і работніцы МТС, спецыялісты сельскай гаспадаркі! Паспяховым правядзеннем веснавой сяўбы забяспечым высокі ўраджай у 1945 годзе! Дадзім фронту і краіне больш прадуктаў харчавання і сыравіны!

Няхай жыве наша магутная совецкая Радзіма!

Няхай жыве непераможная Чырвоная Армія, армія-вызваліцельніца, якая выгнала нямецка-фашысцкіх захопнікаў з совецкай зямлі і грэміць гітлераўскія полчышчы на тэрыторыі Германіі!

Няхай жыве наш бацька, правадыр і настаўнік таварыш Сталін!

Смерць нямецкім захопнікам!

Старшыня арцелі Г. УСАЎ; калгаснікі і калгасніцы: Е. ДАВЫДЗЕНКА, Г. БІРЫЛА, А. СЕРДЗЮКОЎ, Ф. НІКІЦЕНКА, П. КУШНЯРОЎ, Л. СЕРДЗЮКОВА, А. СЕРДЗЮКОВА, Ф. ЦЕЛЯШОВА, А. БІРЫЛА, С. КІРЫЧЭНКА.

У СОЎНАРКОМЕ БССР І ЦК КП(б)Б

Аб выніках соцыялістычнага спаборніцтва прадпрыемстваў мясцовай прамысловасці і промкааперацыі за люты 1945 года

Разгледзеўшы вынікі соцыялістычнага спаборніцтва прадпрыемстваў мясцовай прамысловасці і промкааперацыі за люты 1945 года, Совет Народных Камісараў БССР і Цэнтральны Камітэт КП(б) Беларусі **пастанавілі:**

Уручыць пераходныя Чырвоныя Спягі Совета Народных Камісараў БССР і Цэнтральнага Камітэта КП(б) Беларусі лепшым прадпрыемствам мясцовай прамысловасці і арцелям промкааперацыі:

а) Радыёзаводу імені Молатава ў горадзе Мінску, калектыў якога ў кароткі тэрмін аднавіў завод, адрамантаваў абсталяванне, арганізаваў выпуск высокаякасных рэпрадуктараў і выканаў вытворчы план на 111 процантаў.

Выдаць радыёзаводу імені Молатава грашовую прэмію ў суме 10.000 рублёў для прэміравання рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых, якія асабліва вызначыліся ў соцыялістычным спаборніцтве;

б) Брэсцкаму аблвыканкому і абкому КП(б)Б, з наступным уручэннем лепшаму прадпрыемству мясцовай прамысловасці вобласці. Брэсцкая область выканала план па валавому выпуску прадукцыі на 151,6 процанта і перавыканала план па галоўнейшых відах вырабаў: піламатэрыялах, абозному інвентару, ганчарнай пасудзе, мылу гаспадарчаму, швейных вырабах. У вобласці арганізавана і працуюць 14 промкамбінатаў з наяўнасцю ў іх 224 прадпрыемстваў.

Выдаць грашовую прэмію ў суме 15.000 рублёў для прэміравання работнікаў мясцовай прамысловасці Брэсцкай вобласці, якія асабліва вызначыліся ў соцыялістычным спаборніцтве;

в) Мінскаму аблвыканкому і абкому КП(б)Б, з наступным уручэннем лепшаму прадпрыемству вобласці. Мінская область выканала план па арцелях прамысловай кааперацыі на 128,2 процанта, выканала і перавыканала план па галоўнейшых відах вырабаў: скураных таварах, індывідуальнаму пашыву адзення, па валяльных вырабах.

Выдаць грашовую прэмію ў суме 10.000 рублёў для прэміравання работнікаў промарцелей Мінскай вобласці, якія асабліва вызначыліся ў соцыялістычным спаборніцтве.

Ад Совецкага Інформбюро

(Працяг)

рухомыя злучэнні і пяхота, пасля ўпорных баёў, авалодалі горадам Прэсбаум, размешчаным на чыгунцы Вена — Лінц. Развіваючы поспех, совецкія часці прасунуліся ўперад на 20 кілометраў і штурмам занялі горад Клостэрнойбург, на правым беразе Дуная, у 5 кілометрах на паўночным захадзе ад Вены. Такім чынам, нашы войскі абышлі Вену не толькі з паўднёвага ўсхода і поўдня, але таксама і з захада і паўночнага захада. Праціўнік упорна супраціўляецца, чапляецца за кожны рубеж, імкнучыся спыніць нашы наступаючыя часці. Побач з танкавымі і пяхотнымі дывізіямі немцы кідаюць у бой запасныя палкі, часці асобага назначэння, жандарскія атрады, курсантаў афіцэрскіх школ і другія падраздзяленні. Нашы войскі, адбіваючы варожыя контратакі і адкідваючы праціўніка, настойліва прасоўваюцца ўперад. Авалодаўшы прыгарадамі, совецкія штурмавыя групы вядуць вулічныя баі ў паўднёвай частцы горада Вены. Занят арсенал і іншыя апорныя пункты немцаў. На працягу дня знішчана да 3.000 салдат і афіцэраў праціўніка. Совецкія лётчыкі знішчылі нямецкі бронепоезд і эшалон з боеприпасамі.

Падраздзяленне гвардыі маёра Ганзенка, абышоўшы вельмі ўмацаваны апорны пункт немцаў, з тылу атакавала варожы гарнізон. У выніку вельмі жорсткага вулічнага бою совецкія гвардзейцы разграмілі праціўніка і авалодалі апорным пунктам. У ходзе бою знішчана больш роты гітлераўцаў. Захоплена 17 зенітных гармат, 8 станкавых кулямётаў і склад з боеприпасамі. Два нашыя танкі, з дэсантам аўтаматчыкаў пад камандай гвардыі старшага сержанта Кузнецова, пераправіліся праз раку і замацаваліся на яе заходнім беразе. Адбіваючы варожыя контратакі, совецкія байцы знішчылі два нямецкія танкі, самаходную гармату, бронетранспарцёр і забяспечылі пераправу праз раку свайго батальёна. Гвардзейцы-аўтаматчыкі пад камандаваннем лейтэнанта Данілава выбілі немцаў з аднаго населенага пункта. Аўтаматчыкі знішчылі вялікую групу гітлераўцаў і ўзялі 70 палонных. Гвардыі сержант Хорсаў ноччу падпоўз да варожага бронетранспарцёра, падарваў яго гранатай, а затым знішчыў немцаў, якія знаходзіліся ў бронетранспарцёры.

* * *

Авіяцыя Чырвонасцяжнага Балтыйскага флота патапіла ў Данцыгскай бухце нямецкі эсмінец і транспарт водазмяшчэннем у 5.000 тон. Апрача таго, пашкоджаны дзве быстраходныя дэсантныя баржы і адзін мінаносец праціўніка.

ВЕСТКІ З ПАЛЁЎ

НОРМЫ ВЫКОНВАЮЦЬ НА 200 ПРОЦАНТАЎ

ШКЛОЎ. (Па тэлефону ад спец. кар. «Звязды»). Большасць калгасаў раёна прыступіла да палявых работ. Узарана першая сотня гектараў. Некаторыя калгасы пачалі сяўбу ранніх збожжавых культур. Так, калгас «Іскра», Гарадзецкага сельсавета, засеяў 12 гектараў аўса.

Разам з аратымі, сеяльбітамі і баранавальшчыкамі на палі выйшлі агітатары. Яны знаёмяць калгаснікаў са зваротам калгаснікаў Кубані аб разгортванні ўсесаюзнага сацыялістычнага спаборніцтва за высокі ўраджай.

З кожным днём расце вытворчая актыўнасць калгаснікаў. Аратыя з брыгады Матросава (калгас «Іскра») за першы дзень работы ўзаралі па 0,40 гектара. На другі дзень кожны з іх узараў па аднаму гектару, выканаўшы норму выпрацоўкі на 200 процантаў. Якасць ворыва добрая.

Сістэматычна перавыконваюць нормы выпрацоўкі аратыя Анатолій Грахольскі і Андрэй Жуйка з калгаса «VII з'езд совецкіх». Яны штодзённа ўзорваюць па 0,70 гектара пры норме 0,45 гектара.

У АДКАЗ НА ЗАКЛІК КУБАНЦАЎ

КАПЫЛЬ, 7 красавіка. (БЕЛТА). Калгаснікі і калгасніцы раёна абмеркавалі зварот кубанцаў і ўступілі ва ўсесаюзнае сацыялістычнае спаборніцтва. Яны абавязаліся поўнасцю аднавіць даваенную пасеўную плошчу, значна пашырыць пасевы шматгадовых і аднагадовых траў, сабраць ураджай яравых збожжавых 10 цэнтнераў, азімых 11 цэнтнераў і бульбы 130 цэнтнераў з гектара.

Для гэтага ўсе 106 калгасаў раёна выдатна падрыхтавалі насенне, цяглавую сілу і сельгасінвентар. Калгасы Бабаўнянскага, Пясочанскага і Слабада-Кучэнскага сельсоветаў пачалі ўжо ворыва пад яравыя культуры. Аратыя значна перавыконваюць дзённыя нормы. Брыгада Надзежды Жучкевіч з калгаса «Комуніст», Пацейкаўскага сельсавета, прывучыла хадзіць у упражы 15 кароў. Зараз яны на палявых работах узорваюць па 0,25 гектара ў дзень. Брыгада Жучкевіч абавязалася вырасціць 7 цэнтнераў ільноваланна з гектара. Для гэтага сіламі членаў брыгады вывезена па 50 тон гною на 1 гектар.

Сяўбу яны правядуць у лепшыя агратэхнічныя тэрміны. Калгас імені Кагановіча, Капыльскага сельсавета, паспяхова падрыхтаваўся да сяўбы. Тут прывучана да прапы 25 кароў, для іх падагнана і адрамантавана збруя.

Улічыць недахопы

РУДЗЕНСК. (Па тэлефону ад кар. «Звязды»). З кожным днём у раёне ўсё шырэй разгортваюцца палявыя работы.

Чацверты дзень працуюць на ворыве калгаснікі сельгасарцелі «11 ліпеня», Цытвянскага сельсавета. Калгаснікі Павел Ачаноўскі і Ганна Семашчук узорваюць па 0,5 гектара.

Абмеркаваўшы зварот калгаснікаў сельгасарцелі імені Чырвоных партызан, Краснадарскага края, калгаснікі арцелі «Новы шлях», Рудзенскага сельсавета, уключыліся ва ўсесаюзнае сацыялістычнае спаборніцтва. Яны абавязаліся веснавую сяўбу правесці ў самыя сціслыя тэрміны і на высокім агратэхнічным узроўні. Разгортваючы сацыялістычнае спаборніцтва, калгаснікі гэтай арцелі ўжо ўзаралі 60 гектараў. Якасць ворыва добрая. Адначасова з ворывам у калгасе возяць гной пад раннюю бульбу.

У калгасе «Чырвоны Пупілавец», Сяргеевіцкага сельсавета, пачалі сяўбу лубіну.

Выйшлі на ворыва і калгаснікі сельгасарцелі «Чырвоны сняг», Рудзенскага сельсавета. У першыя дні тут выявіўся рад істотных недахопаў. Індывідуальная здзельшчына ў калгасе не прымяняецца. Нормы выпрацоўкі па ворыве не ўстаноўлены. Працадні аратым налічваюцца пароўну.

У ПРАКУРАТУРЫ РЭСПУБЛІКІ

У мэтах умацавання працоўнай дысцыпліны і павелічэння выпуску прадукцыі на прадпрыемствах ваеннай прамысловасці, Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета Саюза ССР ад 26 снежня 1941 года ўстаноўлена суровая крымінальная адказнасць за дэзертырства з абаронай прамысловасці.

Органамі пракуратуры БССР ускрыты факты, калі некаторыя службовыя асобы прадпрыемстваў, устаноў і старшыні праўленняў калгасаў не толькі не праводзяць барацьбы за правядзенне ў жыццё ўказанага закона ў справе ўмацавання працоўнай дысцыпліны, а, наадварот, патураюць дэзертырам з прадпрыемстваў абаронай прамысловасці і, укрываючы іх ад законнай адказнасці, прымаюць на работу.

1. Дырэктар Ачоса-Руднянскага спіртазавода **Андрэеў** Мацвей Леонцьевіч, загадзя ведаючы, што грамадзяне **Мохарава Д. Н., Сыботава** і другія з'яўляюцца дэзертырамі з абаронай прамысловасці, прыняў іх на работу.

Андрэеў аддан пад суд па арт. 196-1 КК БССР і прыгавораны да 2-х год пазбаўлення волі.

2. У Краснапольскім раёне загадчык цагельнага завода — галоўны майстар **Карначоў**, ведаючы аб тым, што **Ляшчова, Пахомава, Верам'ёва** і **Белакурава** дэзертыравалі з прадпрыемства ваеннай прамысловасці і расшукваюцца следчымі органамі, прыняў іх на работу. Калі ўказаныя асобы былі арыштаваны, **Карначоў** разам з бухгалтарам райпромкамбіната **Кавалёвай** выдалі фальшывыя даведкі ў тым, што ўказаныя асобы ўвесь час працавалі на заводзе.

За зробленае злачынства **Карначоў** асуджан на два гады пазбаўлення волі, а **Кавалёва** — на 1 год пазбаўлення волі.

3. У калгасе імені Калініна, Пераростаўскага сельсавета, Гомельскай вобласці, былі мабілізаваны на будаўніцтва абаронага значэння **Гарбачова Е. Л., Котава Е. Ф.** і **Наумцава І. Д.** Апошнія прапрацавалі на будаўніцтве тры тыдні, дэзертыравалі і вярнуліся ў калгас. Старшыня праўлення калгаса **Цімашэнка** замест таго, каб дэзертыраў прыцягнуць да законнай адказнасці, дапусціў іх да работы ў калгасе.

Укрывацель дэзертыраў **Цімашэнка** аддан пад суд па арт. 196-1 КК БССР і асуджан да аднаго года папраўча-працоўных работ.

4. Старшыня Сталінскага сельсавета **Раманаў** Аляксандр Сідаравіч патураў дэзертырам з ваеннай прамысловасці **Болдыравай, Міхайкінай, Міхаленка, Купрыевай** і **Еўтушэнка** і, скрываючы іх ад крымінальнай адказнасці, накіраваў на другую работу.

Укрывацель дэзертыраў **Раманаў** прыцягнут да крымінальнай адказнасці.

5. Дырэктар Церахоўскага райпромкамбіната **Анока М. М.** аддан пад суд па арт. 196-1 КК БССР за тое, што без папярэдняй праверкі, незаконна прыняў на работу **Церахава**, дэзертыра з абаронага завода, чым фактычна стаў на шлях патурання дэзертырам.

ЗА СТО ПУДОЎ ЗБОЖЖА З ГЕКТАРА

ЧЭРВЕНЬ. (Кар. «Звязды»). Па-баявому рыхтуецца да палявых работ калгас «Большэвік». Тут ужо даўно ачышчана насенне і закончан рамонт сельскагаспадарчага інвентару.

Асаблівую ўвагу звярнулі калгаснікі на падрыхтоўку цяглавай сілы. Лепшы конюх арцелі тав. Гаманюк старанным доглядам коней дабіўся таго, што ўсе яны маюць сярэднюю і вышэйсярэднюю ўкормленасць.

Вывучаючы пастанову СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб развіцці сельскай гаспадаркі на 1945 год і абмеркаваўшы ўсе магчымасці сельскагаспадарчай арцелі, калгаснікі рашылі атрымаць у гэтым годзе 100 пудоў збожжавых і 150 цэнтнераў бульбы з гектара.

Каб забяспечыць такі ўраджай, калгаснікі вывозілі ў поле 300 тон гною, 600 тон торфу і сабралі 20 цэнтнераў попелу і птушынага памёту.

Па ініцыятыве звеннявых тт. С. Урбановіч і Н. Шут у калгасе наладжана агратэхнічная вучоба. Лекцыі ў агратэхнічным гуртку чытае калгасны аграном тав. Гаўруковіч.

Завяршаюць падрыхтоўку да сяўбы і калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі «Чырвоны сняг». Яны выклікалі на сацыялістычнае спаборніцтва за лепшае правядзенне сяўбы калгас «Новыя дарогі». Два спаборнічаючыя калгасы абавязаліся слўбу збожжавых закончыць за 8—9 дзён, бульбу пасадзіць за 10 дзён.

У сацыялістычнае спаборніцтва калгасаў за лепшае правядзенне веснавой сяўбы ўключыліся і сельгасарцелі «Чырвоны партызан» і «Чырвоныя Ляды».

Зямля вяртаецца сялянам

ПІНСК. (Кар. «Звязды»). Пры панскай Польшчы на Піншчыне велізарныя зямельныя масівы належалі польскім магнатам і памешчыкам. Яны карысталіся 498.860 гектарамі ў той час, як значная колькасць сялян мела ўсяго 121.411 гектараў. Зусім не мелі зямлі 3.400 сялянскіх гаспадарак. У вёсцы Пачапава па 150 гаспадарак было толькі 4 гектары выгану.

— У спадчыну ад бацькі,—гаворыць селянін вёскі Мокрая Дуброва, Лагішынскага раёна, К. Дубнавіцкі,—я атрымаў 0,30 гектара зямлі. Сям'я была вялікая і галадала. Прыходзілася арандаваць зямлю ў памешчыка Міхаіла Орды, або ў кулакоў за палавіну ўраджаю. Біўся я, як рыба аб лёд, а з галечы выбрацца не мог і грошай для закупкі зямлі не сабраў.

Заветную мару сялян заходніх абласцей здзейсніла совецкая ўлада. У 1939—1940 годах 16.549 сялянскіх гаспадарак атрымалі 161.078 гектараў памешчыцкай зямлі. Апрача гэтага, 21.257 гектараў атрымалі сяляне, уступіўшыя ў калгасы.

Пачалося новае радаснае жыццё для былых батракоў і беднякоў Піншчыны.

Нашэсце нямецкіх разбойнікаў абарвала іх радасную працу і жыццё. Немцы адабралі ў сялян зямлю і пачалі аднаўляць памешчыцкія маёнткі. Прыехалі на Піншчыну нямецкія памешчыкі. Жыццё змяніла сваё аблічча. Сяляне зноў сталі батракамі ў нямецкіх бюргераў.

Чырвоная Армія выгнала нямецкіх нягоднікаў з нашай зямлі. Адабраная немцамі зямля вяртаецца іх законным гаспадарам.

У Ленінскім раёне 20 сем'яў былых батракоў пана Замынскага зноў атрымалі зямельныя ўчасткі. Маці двух франтавікоў Марта Адамовіч атрымала 3,25 гектара зямлі, 2,5 гектара сенажаці і 1 гектар выгану 6 гектараў зямлі атрымаў Станіслаў Шанюра. Надзелены зямлёю і былыя батракі пана Замынскага—Карп Статкевіч, Аляксей Статкевіч, Аляксей Цішкевіч і другія.

Надзелены зямельнымі ўчасткамі і былыя батракі пана Бакуненка. Так, батрак вёскі Крыўчына Сцяпан Шкутовіч атрымаў 5,5 гектара зямлі. Па 2,5 гектара добрай глебы адведзена Пракопу Шкутовічу, Івану Шкутовічу і многім другім.

У Драгічынскім раёне зямля ўжо адведзена 1.209 малазямельным сялянскім гаспадаркам. У іх карыстанні зараз 2.218 гектараў зямлі, якая раней належала памешчыкам маёнткам. 85 гаспадарак гэтага раёна атрымалі 208 гектараў з другіх зямельных фондаў.

Усяго па вобласці 3.471 сялянскай гаспадарцы вернута 21.938 гектараў зямлі, якую адабралі ў іх немцы ў часе свайго крывавага гаспадарання.

Сяляне Пінскай вобласці шчыра дзякуюць совецкай уладзе за зямлю і свабоднае жыццё. Яны абавязваюцца веснавую сяўбу правесці хутка і высокаякасна, каб высокім ураджаем дапамагчы Чырвонай Арміі хутчэй дабіць фашысцкага зверя.

Нік. Эрдман.



Нямецкая гармата, захопленая нашымі войскамі. (Фотахроніка ТАСС).

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ Ў ЗАХОДНЯЙ ЕЎРОПЕ

ЛОНДАН, 7 красавіка. (ТАСС). У паведамленні штаба вярхоўнага камандавання экспедыцыйных сіл саюзнікаў гаворыцца, што войскі саюзнікаў, якія наступаюць з боку прадмостнага ўмацавання на канале Твентэ, асядлалі дарогу Зютфен-Дэвентэр і знаходзяцца ў двух мілях ад Дэвентэра. Пасля 24-кілометравага марша часці саюзнікаў занялі Мепен. На поўдні ад праціўніка ачышчан Лінген. У раёне Лінгена створана прадмостнае ўмацаванне на рацэ Эмс.

У цэнтральнай Германіі войскі саюзнікаў уступілі ў Лангензальца. Другія часці саюзнікаў знаходзяцца ў 11 кілометрах ад Готы. На ўсходзе ад Рурскага «мяшка» занят рад пунктаў, у тым ліку Гам. Праціўніка ачышчан таксама Эйзенах.

На поўдні вызвалены Вюрцбург; часці саюзнікаў прасунуліся далей на ўсход і поўначы і поўдні ад горада. Занята па. віна Гейльброна.

АРГАНІЗАЦЫЙНАЕ ПАСЕДЖАННЕ ФІНСКАГА СЕЙМА НОВАГА СКЛІКАННЯ

ХЕЛЬСІНКІ, 6 красавіка. (ТАСС). Сёння адбылося арганізацыйнае паседжанне новага сейма. Былі праведзены выбары старшыні і двух віцэ-старшынь сейма.

Старшынёй выбран сацыял-дэмакрат Фагерхольм, які атрымаў 191 голас. Першым віцэ-старшынёй выбран дэпутат Дэмакратычнага Саюза народа Фінляндыі Кай Сундстрэм, які атрымаў 152 галасы. Другім віцэ-старшынёй выбран дэпутат аграрнага саюза Вестэрынен, які атрымаў 192 галасы.

Адразу-ж пасля аб'яўлення вынікаў выбараў кіраўніцтва сейма Фагерхольм, Кай Сундстрэм і Вестэрынен зачыталі тэкст прысягі.

Урачыстае адкрыццё сейма адбудзецца 7 красавіка.

ФАРМІРАВАННЕ НОВАГА ЯПОНСКАГА КАБІНЕТА

ТОКІО, 7 красавіка. (ТАСС). Як перадае агенцтва Домей Цусін, адмірал Судзукі сёння сфарміраваў новы кабінет.

У саставу новага кабінета ўвайшлі: прэм'ер-міністр і па сумяшчэнню міністр замежных спраў і міністр па справах Усходняй Азіі адмірал Кантаро Суцзукі, міністр унутраных спраў Генкі Абэ, ваенны міністр генерал Карэцыка Анамі; марскі міністр адмірал Міцумаса Іонаі і др.

АРЫШТ ЛЕГІЯНЕРАЎ І ПРАФАШЫСТАЎ У РУМЫНІІ

БУХАРЭСТ, 7 красавіка. (ТАСС). Учора газеты апублікавалі спіс 94 легіянераў і прафашыстаў, інтэрніраваных па загаду міністра ўнутраных спраў у лагеры. Ка кал.

МАСАВАЯ ЗДАЧА НЕМЦАЎ У ПАЛОН НА ЗАХОДНІМ ФРОНЦЕ

ЛОНДАН, 7 красавіка. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр перадае афіцыяльнае паведамленне штаба вярхоўнага камандавання экспедыцыйных сіл саюзнікаў аб тым, што за 5 красавіка на Заходнім фронце ўзят палон 40.107 нямецкіх салдат і афіцэраў.

На працягу першых пяці дзён красавіка арміям саюзнікаў здаліся ў палон 146. нямецкія салдаты.

САЮЗНІКІ ЗАХАПІЛІ ЗАЛАТЫ ЗАПАС РЭЙХСБАНКА

НЬЮ-ЙОРК, 7 красавіка. (ТАСС). Карэспандэнт агенцтва Юнайтэд Прэс, які знаходзіцца з часцямі амерыканскай 3-й арміі, паведамляе, што салдаты 90-й дывізіі знайшлі ў саляных капальнях на поўдні ад Мюльхаузена залаты запас германскага імперскага банка.

ЛОНДАН, 7 красавіка. (ТАСС). Як перадае агенцтва Рэйтэр, знойдзены каля Мюльхаузена германскі залаты запас складае прыкладна 100 тон у залатых слітках. Апрача таго, у капальнях знойдзена на мільярды папяровых марак, на 2 мільярды амерыканскіх долараў, 100 мільёнаў франкаў, 110 тысяч англійскіх фунтаў стэрлінгаў, меншыя колькасці іспанскай, турэцкай, португальскай і нарвежскай валюты.

СТАНОВІШЧА У ГРЭЦЫІ

АФІНЫ, 5 красавіка. (ТАСС). Былыя члены палітычнага камітэта нацыянальнага вызвалення (ПЕЕА—орган, які ажыццяўляў адміністрацыйныя функцыі ў партызанскіх раёнах Грэцыі ў перыяд яе акупацыі) і былыя левыя міністры ва ўрадзе Папандрэу наведалі рэгента Дамаскіноса і прэм'ер-міністра Пласціраса і ўручылі ім мемарандум, у якім яны пратэстуюць супроць праследвання ўдзельнікаў нацыянальнага супраціўлення. У мемарандуме падкрэсліваецца, што праследванне асоб, якія працавалі ў органах ПЕЕА, «азначае практычнае асуджэнне вызваленчага руху, накіраванага супроць акупантаў, і прызнанне афінскіх марыянетачных урадаў законнай уладай Грэцыі».

Далей указваецца, што ўрадавыя органы не выконваюць умоў пагаднення паміж урадам і ЭАМ (нацыянальна-вызваленчы фронт) у Варкізе і, тым самым, паказваюць дрэнны прыклад рэакцыйным тэрарыстам арганізацыям. Так, насуперак пагадненню, грэчаскія афіцэры, якія служылі ў ЭЛАС (ваенная арганізацыя ЭАМ), адхілены ад службы ў арміі (80 палкоўнікаў ЭЛАС аказаліся ў адстаўцы), тады як афіцэры, служыўшыя ў «охоўных батальёнах» (сфарміраваных марыянетачным «урадам» Раліса), знаходзяцца ў радах арміі. Г. даўжае існаваць «горная брыгада». Слушчыя-дэмакраты звальняюцца з прычыны іх «палітычнай неблаганадзейнасці». Д. нічаюць законы, выданыя ў 1917 годзе, накіраваныя супроць грамадзянскіх свабод, хоць у Варкізе ўрад абавязаўся ліквідаваць гэтыя законы. Мемарандум падкрэслівае, што становішча ў краіне супярэчыць прынцыпам аб'еднаных нацый і кампраметуе Грэцыю перад сусветнай грамадскай думкай.

ЗАМЕЖНАЯ ХРОНІКА

У Данію прадаўжаюць прыбываць уцякаючыя з Германіі немцы. Іх колькасць ужо дасягнула 300 тысяч чалавек. Гітлераўскія ўлады мяркуюць раскватэраваць у Даніі больш 2 мільёнаў нямецкіх бежанцаў.

* * *

Чылійскі сенат аднагалосна прыняў рашэнне аб аб'яве вайны Японіі.

* * *

У Нью-Йорку Філадэльфійскім аркестрам і Вестмінстэрскім хорам была выканана кантата Пракофьева «Александр Неўскі».

Музыкальныя крытыкі нью-йоркскіх газет даюць кантаце высокую ацэнку.

* * *

У П'ячэнуе (Паўночная Італія) фашысцкімі ўладамі за сувязь з партызанамі расстрэляны 10 патрыётаў. У адказ на гі. шысцкі тэрор італьянскія патрыёты ўзарвалі арсенал у П'ячэнуе.

* * *

У Чылі, у сувязі з шматлікімі дыверсіямі актамі на чылійскіх суднах, арыштаван нямецкі шпіён і дыверсант фон Апе (ТАСС)

МІЖНАРОДНЫ АГЛЯД

У сучаснай заключнай фазе вайны на еўрапейскім кантыненце, як і раней, асноўны цяжар барацьбы супроць азвярэлых гітлераўцаў нясе Чырвоная Армія. Пераход Чырвонай Арміі ў наступленне адразу на некалькіх франтах у першай палавіне студзеня гэтага года знаменаваў пачатак адной з найбольш бліскучых і глыбокіх па свайму замыслу і выкананню аперацый ва ўсёй ваеннай гісторыі. Наступленне совецкіх войск не толькі моцна прыкавала да совецка-германскага фронта асноўныя сілы германскай арміі, але і прымусіла нямецкае камандаванне тэрмінова перакінуць рад сваіх дывізій з Заходняга на Усходні фронт.

Немцы вымушаны былі спыніць сваё контрнаступленне на захадзе. У сваю чаргу нашым саюзнікам прадставіліся надзвычай спрыяльныя магчымасці для пераходу ў наступленне супроць гітлераўскіх войск. 23 лютага саюзныя войскі перайшлі ў наступленне. Да гэтага часу Чырвоная Армія прасунулася ўжо глыбока на тэрыторыю самой Германіі, авалодала яе буйнымі стратэгічнымі пунктамі, пазбавіла немцаў важных ваенна-прамысловых цэнтраў і стварыла непасрэдную пагрозу сталіцы Германіі—Берліну і другім буйнейшым жыццёвым цэнтрам Германіі. У такой абстаноўцы войскі саюзнікаў перасеклі Рэйн і пачалі хуткае прасоўванне ў глыб Германіі.

Англа-амерыканскія танкавыя калоны, якія прасоўваюцца па тэрыторыі Германіі, па прызнанню карэспандэнтаў англа-амерыканскай прэсы, амаль не сустракаюць арганізаванага адпору немцаў. У той-жа час войскам Чырвонай Арміі прыходзіцца ламаць жорсткае супраціўленне гітлераўцаў, якія змагаюцца ў кожным населеным пункце з адчаем людзей, асуджаных на пагібель.

У гэтай барацьбе Чырвоная Армія прадаўжае выматваць і знішчаць асноўныя сілы германскіх армій, бясслаўны канец якіх ужо не за гарамі. За апошні час совецкія войскі разграмілі буйную групіроўку немцаў на паўднёвым захадзе ад Кенігсберга, вызвалілі ўсю тэрыторыю Венгрыі, захапілі Браціславу і ўторгліся ў межы Аўстрыі. Войскі Чырвонай Арміі прасунуліся аж да самай сталіцы Аўстрыі—Вены.

У сваю чаргу англійскія войскі прасоўваюцца ўжо па ўсходзе ад Оснабрука, а часці 3-й амерыканскай арміі выйшлі да горада Гота і ўвайшлі на тэрыторыю Тюрынгіі.

Абстаноўка ўнутры Германіі становіцца ўсё больш напружанай. Расце паніка сярод насельніцтва, рэзка пагаршаецца забяспечанне насельніцтва прадуктамі харчавання, адбываецца маральны распад арміі.

Папярэдні канчатковага паражэння гітлераўцы спешна рыхтуюцца да пераходу ў падполле з мэтай адраджэння ў будучым германскай агрэсіі. Таварыш Сталін гаварыў у сваім дакладзе 6 лістапада 1944 года аб тым, што «нямецкія заправілы ўжо цяпер рыхтуюцца да новай вайны». Як вядома, пераспярога з повалу падрыхтоўкі гітлераўцаў да падпольнай барацьбы была зроблена таксама і англійскім міністрам замежных спраў Ідэнам у палаце абшчын. 30 сакавіка г. г. дзяржаўны дэпартамент ЗША апублікаваў спецыяльную заяву, у якой гаворыцца, што «даставерная інфармацыя, сабраная ўрадамі саюзных краін, ясна паказвае, што нацысцкі рэжым распрацоўваў дэтальныя пасляваенныя планы захавання нацысцкіх дактрын і панавання». Відныя гітлераўцы спешна маскіруюцца, мяняючы пашпарты і месцажыхарства, пераводзяцца на другія работы. Эсэсаўцамі створаны спецыяльныя школы па падрыхтоўцы дыверсантаў, шпіёнаў, тэрарыстаў.

Патрабуецца велізарная пільнасць, каб разбурыць гэтыя планы нямецкіх фашыстаў.

* * *

Відное месца ў гітлераўскіх планах падрыхтоўкі да новай вайны адводзіцца фашысцкай Іспаніі, якую нацысты хочуць скарыстаць у якасці сховішча, у якасці тэрыторыі для стварэння замаскіраваных нямецкіх прадпрыемстваў і так далей. У сувязі з перспектывай хуткага разгрому гітлераўскай Германіі главары фашысцкай Іспаніі спяшаюцца перафарбавацца ў «прыяцеляў дэмакратыі». Некаторыя іспанскія газеты, якія яшчэ нядаўна адкрыта дэманстравалі прыхільнасць фашысцкай Іспаніі да гітлераўскай Германіі, рэкламіравалі дружбу Франко з Гітлерам, цяпер з сур'ёзным відам прабуюць даказаць «розніцу» паміж фалангісцкім і фашысцкім рэжымам і афішыруюць сваё імкненне да дружбы з ЗША і Англіяй.

Да апошняга часу гітлераўцы знаходзяць сабе прытулак і ў Аргентыне. Хоць урад Аргентыны, пад уплывам склаўшайся абстаноўкі, аб'явіў вайну дзяржавам асі, усё-ж ён не змяніў свайго прафашысцкага характару. Карэспандэнт амерыканскай газеты «Нью-Ёрк таймс» паведаміў 3 красавіка з Буэнос-Айрэса, што «ўсяго за некалькі дзён да аб'яўлення Аргентынай вайны краінам асі, аргентынскі ўрад дазволіў нямецкім і японскім дыпламатам, а таксама падазроным агентам краін асі свабодна раз'язджаць па ўсёй краіне». Гэты факт указвае на тое, што фармальнае аб'яўленне некаторымі краінамі вайны Германіі яшчэ не азначае іх шчырага імкнення ўключыцца ў агульны антыгітлераўскі фронт барацьбы Аб'еднаных Нацый.

Аб'яўленне Аргентынай вайны супроць Германіі справядліва расцэньваецца радам замежных газет, як спроба заручыцца давер'ем краін-пераможцаў і пад сцягам гэтага давер'я захаваць у Латынскай Амерыцы нацысцкія цэнтры, здольныя весці падрыўную работу супроць Аб'еднаных Нацый.

Г. БЕСПАЛАЎ.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

10 красавіка, у 19 гадзін, у Доме політыйнай асветы (вялікі зал) адбудзецца структыўны даклад для дакладчыкаў, раённай гурткоў і агітклектываў на тэму «Красавіцкія тэзісы В. І. Леніна».

Дакладчык дацэнт Мацко.

* * *

11 красавіка, у 19 гадзін, у Доме партыйнай асветы (вялікі зал) адбудзецца лекторый урачоў горада. Будзе прачытана лекцыя: «Вялікія рускія ўрачы Боткін, Захар'ін, Остраумаў».

Лектар прафесар Мелкіх.

Дом партасветы

Адказны рэдактар В. САМУЦІН.

У тэатрах і кіно:

Беларускі Дзяржаўны ордэна Леніна тэатр оперы і балета

У памяшканні Дома Чырвонай Арміі 8 красавіка

«АЛЕСЯ»

Пачатак у 19 гадзін 30 мінут.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГУ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР

8, 9 красавіка ПРЭМ'ЕРА

«ВЕЧАР КАМЕДЫІ»

(«Паўлінка», «Прымакі»)

народнага паэта БССР Янкі Купалы

Пачатак у 19 гадз. 30 мінут.

Кінотэатр «Першы»

«НАШЭСЦЕ»

Пачатак сеансаў у 10, 12, 14, 16, 18, 22 гадз.

Кінотэатр «Беларусь»

«ЭДЫСОН»

Пачатак сеансаў у 10, 12, 14, 16, 18, 22 гадз.

Кінотэатр «Радзіма»

«МАЯ ЛЮБОЎ»

Пачатак сеансаў у 20 і 22 гадзіны.

Дзіцячы кінотэатр

«ПАДКІДЫШ»

Пачатак сеансаў у 10, 12, 14, 16 і 18 гадз.

АТ28714 АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: г. Мінск, вул. Пушкіна, 55, 3-ці паверх. Тэлефоны: Адказнага рэдактара—149, Адказнага сакратара—150.